Водгук
на аўтарэферат дысертацыі А. Д. Гаршкова
"Культура бромэ ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана:
засяленне, храналогія, матэрыяльная культура",
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія

Дысертацыйнае даследаванне А. Д. Гаршкова прысвечана вывучэнню помнікаў культуры бромэ ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана. Гэта тэрыторыя лічылася да апошняга часу недастаткова даследаванай, і менавіта храналагічны адрэзак фінальнага палеаліту закранаўся ў айчыннай археалагічнай літаратуры фрагментарна. Сістэматычнае ўвядзенне ў навуковы зварот матэрыялаў фінальнапалеалітычных стаянак пачалося з першай паловы 1990-х гадоў. Таму актуальнасць выбранай тэматыкі не выклікае сумненняў.

Дысертацыйная праца А. Д. Гаршкова першая спроба самастойнага погляду на культуру, якая не прывязана да азначай тэрыторыі даследавання, але час ад часу ўзгадвалася ў сувязі з праблематыкай генезісу мезалітычных культур Верхняга Падняпроўя.

Мэту даследавання аўтар вызначае, як "выяўленне асаблівасцяў развіцця культуры броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана". Але ў адной з задач, якая накіравана на дасягненне мэты заўважаецца паўтор " выявіць …асаблівасці паселішчаў". Адныя і тыя ж словы, напэўна трэба больш уважліва падбіраць фармуліроўку задачы, альбо шукаць трывалыя сінонімы для мэты.

Назва тэмы дысэртацыі таксама належным чынам, на мой асабісты погляд, не прапрацавана. Слова і тэрмін культура паўтараюцца ў ёй двойчы, прычым ў розных сэнсавых кантэкстах (археалагічная і матэрыяльная культура).

І калі завяршыць разважанні па тэме дысертацыі, то трэба звярнуць увагу на тую акалічнасць, што тэрмін міжрэчча звычайна выкарыстоўваецца, як мясцовасць паміж двума сумежнымі рэкамі, уключаючы водападзельную прастору і судакранальныя схілы рачных далін. У назве ж прысутнічаюць тры ракі, прычым яны адносяцца да розных басейнаў: Заходні Буг і Нёман да басейна Балтыйскага мора, Прыпяць да басейна Чорнага мора.

У падраздзеле "Сувязь даследавання з навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі" адсутнічае назва індывідуальнага планавага задання аўтара дысертацыі ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў "Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы" на 2021 – 2025 гг.

У раздзеле "Навуковая навізна" паўтораны амаль тымі ж словамі тэзіс, які адлюстраваны ў першай задачы на с. 3 "вызначыць прыродна-кліматычныя ўмовы фінальнага этапу позняга плейстацэну і раскрыць іх уплыў на засяленне міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана носьбітамі культуры броме". Для параўнання на с. 4 аўтарам ужо "вызначаны ўплыў

прыродна-кліматычных умоў на ступень засялення і спецыфіку гаспадарча-культурнага тыпу паляўнічых-збіральнікаў".

Аб'ект даследавання выбраны, зноў жа па майму ўласнаму меркаванню, занадта шырока – фінальны палеаліт усёй краіны.

У першым палажэнні, якое выносіцца на абарону, вельмі дзіўна выглядае пасыл аўтара аб тым, што генезіс культуры звязаны з вывяржэннем вулкана Лах у Германіі каля 13 тыс. гадоў таму. А далей на думку аўтара гэтая падзея "падзяліла носьбітаў культуры федэрмесер на дзве групы (па тэксту "Заключэнне" на некалькі груп?). Як можа вывяржэнне вулкана паўплываць на генезіс насельніцтва, не зусім зразумела? Дарэчы ў тэксце гэтага палажэння двойчы праз адзін сказ паўтараецца словазлучэнне "культурная адзінка".

Другое палажэнне прысвечана лакальным адрозненням у размяшчэнні паселішчаў, але ніводнай стаянкі з Заходняга Буга і Прыпяці не прыведзена, толькі 6 помнікаў з басейна р. Нёмана. Пасля азнаямлення з далейшай часткай палажэння складваецца ўражанне сумбурнасці, стойкай упэўненасці і катэгарычнасці ў сказах-канстатацыях аўтара. А між тым не ўсё так адназначна. Чаго толькі варта безапеляцыйнае вызначэнне "месца майстра і вучня"? Па чым, па прадуктах першаснай апрацоўкі, па колькасці адыходаў вытворчасці, па відах і катэгорыях дэбітажу, па невыкарыстаных нарыхтоўках?

Не зусім ясна, што гэтым палажэннем аўтар выносіць на абарону: пералічаны тапаграфічныя рысы паселішчаў, затым адзначаецца аб'ект палявання, характар стаянак, выдзяляецца толькі адзін тып паселішчаў (стаянкі-майстэрні) і гаспадарчыя зоны, напэўна толькі для гэтай катэгорыі помнікаў?

Трэцяе палажэнне пачынаецца з тэзіса аб тым, што тэхніка-марфалагічны аналіз матэрыялаў з тэрыторыі даследавання паказвае іх поўнае падабенства з калекцыямі помнікаў асноўнага арэала культуры броме. Але ж гэтае "поўнае" падабенста аднабаковае. Наўрад ці аўтар знаёміўся з калекцыямі ўжывую, а параўнанне і высновы на падставе публікацый не могуць успрымацца як бездакорныя, яны у большай ступені гіпатэтычныя.

У чацвёртым палажэнні зноў узгадваецца вывяржэнне вулкана, але ужо для таго вызначыць час з'яўлення носьбітаў культуры броме ў трохрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана. Адсутнасць радыёвугляродных датыровак для вызначанай тэрыторыі праблема, якую трэба вырашаць, а не фіксаваць у якасці часткі палажэння, якое трэба даказваць.

У асабістым укладзе, на мой розум, у першую чаргу трэба падкрэсліваць уласную палявую працу аўтара, з дакладнай фіксацыяй плошчы даследавання на кожным помніку (іх толькі 6). З тэксту толькі ясна, што агульная плошча на помніках культуры броме складае 86 м$^2$. Але не вызначана на якіх? Колькі артэфактаў, менавіта культуры броме, здабыты пад час раскопак аўтара.

У раздзеле 1.1 “Гістарыяграфія даследавання” асноўнай часткі дысертацыі прыведзены агляд “літаратуры па тэме даследавання”. Але шмат якія літаратурныя крыніцы даволі ўскосна альбо ў самым агульным выглядзе адносяцца да “броме-лінгбійскай” праблематыкі. Спасылкі на манаграфіі і каталогі пажадана рабіць больш карэктна. Напрыклад, не на весь аб’ём сумеснага выдання Калечыц А. Г., Коласаў А. У., Абухоўскі В. С. Палеалітычныя помнікі Беларусі (культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя крыніц). – Мінск: Беларуская навука, 2010. – 323 с., а на канкрэтныя старонкі тэксту і ілюстрацыі, прысвечаныя культуры броме, якая ёсць у назве дысертацыі. Да і каталог, створаны прыведзенымі аўтарамі, ўключае не толькі фінальнапалеалітычныя помнікі. Там яшчэ прысутнічаюць і нешматлікія помнікі позняга палеаліту.

У раздзеле 1.2 “Крыніцы” база крыніц, здабытая аўтарам пад час раскопак прадстаўлена вельмі сціпла. Прыведзены толькі пералік шасці стаянак Кавальцы 1,2, Гродна 14, Гарадзішча 7, Пагараны 1, Зальвяны 2. Але з якіх геаграфічных частак “трохрэчча”, ні басейн ракі не пазначаны, ні адміністрацыйныя раёны. Назва Гарадзішча вельмі распаўсюджаная: у першым томе энцыклапедыі “Археалогія Беларусі” археалагічных помнікаў і комплексаў з такім наіменаваннем прыведзена пяць, у тым ліку і з Пінскага раёна. І наколькі мне вядома матэрыялы Гарадзішча 7 адносяцца да свідэрскай культуры!

У раздзеле 2.2 “Уплыў прыродных умоў на засяленне міжрэчча Заходняга Бугу, Прыпяці і Нёмана носьбітамі” у другім абзацы на с. 12 аўтар дысертацыі схіляецца да канцэпцыі Ф. Райдэ і распавядае не пра дзве, а ўжо пра тры групы насельніцтва культуры федэрмесер. Так дзве, тры ці некалькі груп!? Ісціна дзесьці побач!

На с. 14 у раздзеле 3.4 “Асаблівасці прысвоўваючых формаў гаспадаркі” аўтар распрацоўвае новы рэвалюцыйны падыход да трактоўкі тэрміна збіральніцтва. Традыцыйная трактоўка: **Збіра́льніцтва** — збіранне, здабыванне гатовых дароў прыроды, у асноўным прадметаў харчавання і лекавых траў; самы старажытны занятак чалавецтва. У аўтара дысертацыі **збіральніцтва** ў фінальным палеаліце – гэта “збор крамянёвай сыравіны, здабыча дрэва і рога”!

У кароткай характарыстыцы главы 4 “Храналогія і гістарычны лёс культуры броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана” пяты раз ўзгадваецца “галоўная падзея” ў жыцці носьбітаў культуры броме – выбяржэнне вулкана Лах! Чытач яшчэ двойчы сустрэне гэтую знакавую для дысертацыі з’яву ў высновах заключэння на с. 15 і с. 18.

Гістарычны лёс броме-лінгбійскай супольнасці (папуляцыі, культурнай адзінкі) у тэксце главы 4 аўтарэферата выражаны адным сказам і на думку аўтара дысертацыі звязаны з арэнсбургскай, валкушанскай і краснасельскай культурамі. Але гэтыя культурныя з’явы могуць быць не рознымі па сутнасці, а адлюстровываць усяго толькі своеасаблівасць у лакальнасці

назвы: Арэнсбург для Германіі, Волкуш для Польшчы, Краснаселле для Ўкраіны.

І апошняя заўвага па зместу заключэння аб асноўных навуковых выніках даследавання, якая тычыцца штучна створаных “на дадзены момант беларускай гістарыяграфіяй” мезалітычных культур: днепра-дзяснінскай і сожскай. Па матэрыялах першай напісана і паспяхова абаронена У. П. Ксянзовым у 1994 годзе доктарская дысертацыя “Мезолитические культуры Белорусского Подвинья и Поднепровья”. Другая ж культура прадстаўлена ў кандыдатскай дысертацыі В. Ф. Капыціна “Мезолит юго-восточной Белоруссии” 1977 года.

Напрыканцы хочацца парэкамендаваць дысертанту абавязкова выправіць хібы і недарэчнасці, якія час ад часу заўважаюцца ў тэкставай частцы, спісе публікацый і рэзюмэ.

Тытульны ліст: Памылка. Напісана на **атрыманне** вучонай ступені, а трэба на саісканне вучонай ступені.

С. 2 абдрукоўка **прыродазначаўчых** навук, а павінна быць прыродазнаўчых. С. 9 1-ая страка стылістычная памылка: па тэксту “**былі з’явіліся**”. Слова былі залішняе. С. 14 абдрукоўкі **помнкіі** (помнікі), **даследыкам** (даследчыкам). С. 21 другі абзац у назве артыкула за № 12 ёсць абдрукоўка на тэрыторыі **Беларус**, павінна быць напісана Беларусі. С. 25 недакладны пераклад на рускую мову. У рэзюмэ на беларускай мове на с. 24 значыцца слова агульнанавуковыя …метады. У рускамоўным рэзюмэ замест гэтага тэрміна з’яўляецца слова: **общеисторические**.

Трэба асобна вычытаць тэкст на прадмет ужывання літары ў (у нескладовае). У тэксце аўтарэферата недакладнае напісанне фіксуецца на с. 1 (2 разы), с. 6, с. 9. І калі тыя ж памылкі будуць прысутнічаць і ў тэксце дысертацыі, то безумоўна іх трэба выпраўляць.

На мой асабісты погляд, самая небездакорная частка, калі прымаць ў разлік тэкст аўтарэферата, крыніцазнаўчая база дысертацыі. Не можа ў адзін ранг узводзіцца праца з “чужымі” калекцыямі і ўласная палявая даследчыцкая работа. Дзе аўтарская частка сярод 40 тысяч прааналізаваных крамянёвых артэфактаў? Яна размытая у агульнай колькасці і пералічэннях! З заяўленых у назве засяленні, храналогіі і матэрыяльнай культуры носьбітаў “культурнай адзінкі” броме дзве першыя пазіцыі раскрыты на вельмі туманным гіпатэтычным узроўні аўтарскіх фантазій і здагадак.

Спадзяюся, што крытычныя заўвагі, будуць карыснымі для аўтара дысертацыі ў далейшай навуковай працы. Аўтарэферат А. Д. Гаршкова фармальна адпавядае структуры і зместу дысертацыйнага даследавання. Пералічаныя сумненні скіраваны на тое, каб падкрэсліць, што разглядаемая дысертацыя павінна быць напоўнена канкрэтыкай і аналізам. А дасягаецца гэта праз карпатлівую і манатонную, не заўджы ўдзячную ўласную працу ў раскопе. Стандартную фразу аб тым, што аўтар заслугоўвае прысваення ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.06 –

“археалогія” на даным этапе дыскусіі і абмеркавання, я бы не спяшаўся вымаўляць.

Старшы навуковы супрацоўнік
Інстытута гісторыі НАН Беларусі,
кандыдат гістарычных навук І. М. Язэпенка
13.05.2024 г.

Подпіс Язэпенка І. М. сведчу
Вяд. спецыяліст па кадрах
"15" 05 2024 г.